*Серый Захар Андреевич*

**«Другая маці»**

Прыгадаю дарослым настаўніцу,
Калі шлях мой да дому працягнецца.
Там малы побач з ёй у гімназіі
Велічэзныя сее фантазіі.

Любіць мову ён і матэматыку,
Ды не бачна з-за парты выдатніку,
Што ўсмешка жанчыны прыхоўвае
Надта цяжкае крэда жыццёвае.

Надрываць свае плечы пад сумкамі,
Клапаціцца вучнёўскімі думкамі,
Ноччу з сшыткамі спаць, каб у раніцу
Той уважліва слухаў настаўніцу.

З кожнай тканай на твары маршчынаю
Адзін хлопчык сталее мужчынаю.
Пасівела яшчэ валасіначка –
То ўзрасла прыгажуня-дзяўчыначка.

Шчыры дзякуй кажыце асветніцам,
Кожны водгук так дорага цэніцца!
Прылятайце ў гняздо, дзе са спадчынай
Настальгія спатканне назначыла.

Хай цудоўныя рысы жаночыя
Прыгадаю далей не аднойчы я,
Але мілая маці – настаўніца –
Назаўжды ў маім сэрцы застанецца.